# ДОЎГАЯ ДАРОГА ДАМОЎ

## З успамінаў С. Д. Шляхоткі, г.п. Вялікая Бераставіца

Сяргей Данілавіч Шляхотка сустрэў вайну 12-гадовым хлапчуком у вёсцы Урач Слонімскага раёна. У іх сям'і было шасцёра дзяцей.



*С. Д. Шляхотка.*

- У 1942 годзе акупанты занялі вёску, - успамінае Сяргей Данілавіч. - Тады ў лясах ішлі баі з партызанамі, і паліцаі вельмі жорстка распраўляліся з вяскоўцамі за кожнага забітага нямецкага салдата. У адзін са снежаньскіх дзён 1942-га года быў застрэлены нямецкі афіцэр. Акупанты сагналі ўсіх жыхароў у цэнтр вёскі. Паліцай па спісу адабраў людзей і загадаў выкапаць роў, а потым з кулямёта ўсіх расстралялі. Па шчасліваму выпадку наша сям'я не папала пад расстрэл. Але мяне з сястрой забралі ў слонімскую турму. Адтуль накіравалі ў Заходнюю Германію ў горад Уперталь. Потым у канцлагер Дзюсельдорфа. Гэта ўжо быў верасень 1943-га года.

Сяргей Данілавіч з болем у сэрцы ўспамінае тыя дні: як цяжка працавалі, разгружалі баржы з цэглай і цэментам, будавалі прыстанкі для вялікагрузнага транспарту. Выконвалі і іншую работу, якая была проста не па сілах падлетку. А рабіць яе трэба было, інакш – дубінкай па плячах альбо куля ў лоб. Пасля працоўнага дня немцы давалі кожнаму вязню 300 грамаў хлеба, 15 грамаў маргарыну і літр «баланды».

- Сваё імя я амаль запамятаваў,- расказвае Сяргей Данілавіч. - Аклікалі - «нумар 121». 9 верасня 1944-га года, падчас бамбардзіроўкі амерыканскай авіяцыяй, мяне цяжка параніла. Уцякаць у бомбасховішча вязням не дазвалялі. Мы знаходзіліся пад адкрытым небам, «на мушцы» то ў амерыканцаў, то ў англічан. Чарговая такая бомба ўпала непадалёку ад мяне. Як застаўся жывым - не ведаю. Асколкамі парвала бядро, прабіла локцевы сустаў, параніла галаву, тулава засыпала зямлёй. Ведаеце, адразу не зразумеў, што здарылася. Бачыў свае акрываўленыя рукі, ногі. Паварушыцца не мог, толькі адчуваў незвычайную гарачыню, пякло ў вачах, а потым я страціў прытомнасць. Апынуўся ў нямецкім шпіталі, у якім знаходзілася каля ста раненых. Пакутаваць там прыйшлося яшчэ больш. Пасля аперацыі я быў слабы, не мог рухацца, а

есць не было чаго. На сто чалавек у дзень - толькі дзве булкі хлеба. Добра, што на двары быў сакавік і можна было знайсці крапіву.

Пасля адступлення немцаў, тэрыторыю занялі амерыканцы і наш лёс цалкам залежаў ад іх. Пасля шпіталя ўсіх вязняў накіравалі ў савецкі фільтрацыйны лагер Народнага Камісарыята ўнутраных спраў СССР: праводзілі перапіс і праверку, дапытвалі. А на паёк - адна жменя мукі. Помню, як ноччу сніўся хлеб. Думаў: ніколі не наемся. Сілы пакідалі і мяне перавялі ў ваенны шпіталь. Там падлячылі і адправілі ў Расію. Па дарозе ў Інстэрбург ва Усходняй Прусіі мяне і іншых знялі з вагона і накіравалі зноў у лагер. А адтуль павінны былі даставіць у Жытомір. Салдаты гаварылі, што вязуць нас працаваць на шахты. Па дарозе я вырашыў уцячы. Калі цягнік спынілі ў Мінску, я наўмысна адстаў ад цягніка. Словам, дарога дамоў была доўгай і цяжкай. Але, з Божай дапамогай, я знайшоў сваю вёску і сям’ю.

- Пасляваенны час, - гаворыць Сяргей Данілавіч, - быў таксама нялёгкім. Аднак на лёс я не скарджуся. Жыў па сумленні, шмат працаваў, разам з жонкай гадаваў сыноў.

Жыццё Сяргея Данілавіча сапраўды адметнае. Працаваў майстрам-сыраробам, працяглы час дырэктарам Бераставіцкага масласырзавода. Узнагароджаны ордэнам Леніна, прымаў удзел ва Усесаюзным аглядзе-конкурсе сыроў высокай якасці, які праходзіў у Эстоніі. І гэта далёка не ўвесь пералік працоўных заслуг Сяргея Данілавіча. Працаваў і ў будаўніцтве, у Баранавічах. А пасля выхаду на заслужаны адпачынак вярнуўся ў Вялікую Бераставіцу.

Алена Рыжко, г.п. Вялікая Бераставіца,
2008 год.